ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г.
14
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 5 (1269)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## НАВІНЫ БДУ

### ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ

і 60-годдзю ЛКСМ Беларусі прысвечаны конкурс на атрыманне прэмій імя Ленінскага камсамола ў галіне навукі і тэхнікі ў 1980 годзе, аб'яўлены Цэнтральным Камітэтам ЛКСМБ.

Да разгляду прымаюцца апублікаваныя ў друку навуковыя даследаванні, якія ўносяць важкі ўклад у развіццё айчыннай навукі, глыбокія тэарэтычныя даследаванні па пытаннях марксісцка-ленінскай навукі і эканомікі; работы па стварэнню і ўкараненню ў народную гаспадарку найбольш перспектыўных тэхналагічных працэсаў, матэрыялаў, машын і механізмаў; работы па ўкараненню перадавога вытворча-тэхнічнага вопыту, маючыя вялікае народнагаспадарчае значэнне.

Прымаюцца работы аўтараў ва ўзросце да 33 гадоў. Аўтарам навуковых даследаванняў, якія ўносяць буйны ўклад у развіццё праблем камуністычнага выхавання моладзі, прэмія можа быць прысуджана незалежна ад узросту.

### ЦІКАВАЯ РАЗМОВА

адбылася ў студэнтаў факультэта журналістыкі з супрацоўнікамі Галоўнай рэдакцыі спартыўных перадач Беларускага тэлебачання і радыё. Гасцямі будучых работнікаў друку былі галоўны рэдактар У. Б. Шпітальнікаў, А. Ф. Аляксееў. Спартыўныя журналісты расказалі аб падрыхтоўцы да Алімпіяды-80, аб творчых пошуках і знаходках, пазнаёмілі студэнтаў са структурай рэдакцыі. У. Б. Шпітальнікаў паведаміў аб новых рубрыках і перадачах, якія будуць паказаны па тэлебачанню ў перыяд падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў у Маскве.

### НОВАЯ КІНАСТУЖКА

«Беларусьфільма» «Дзікае паляванне караля Стаха», знятая па аднайменнай аповесці Уладзіміра Караткевіча, нядаўна дэманстравалася ў актавай зале Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Пасля прагляду кінафільма адбылася сустрэча з яго стваральнікамі — аператарам-пастаноўшчыкам Таццянай Логінавай, мастаком па касцюмах Эленанорай Сямёнавай і мастаком-пастаноўшчыкам Аляксандрам Чартовічам. Размова атрымалася цікавай і жывой. Гледачы задавалі пытанні, не толькі непасрэдна звязаныя з гэтай кінастужкай, але цікавіліся развіццём савецкага кінамастацтва ўвогуле, тым, як выбіраюцца выканаўцы галоўных ролей, і інш.

## ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЬ ХАРАКТАРУ

24 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У САВЕТЫ

**Студэнтка III курса механіка-матэматычнага факультэта Раіса Тарасюк вылучана кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў. Замалёўку аб ёй чытайце на 2-й старонцы.**



## ВУЧОБА АКТЫВУ

ВЯЛІКАЯ ўвага аддаецца вучобе сакратароў камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна. Тых, хто ўпершыню стаў важаком параўнаўча невялікай групы, знаёмяць з іх будучай работай, з той адказнасцю, якая на іх ускладаецца, даюць даручэнні і парады.

Цікава прайшла вучоба і на гэты раз. Спачатку з уступным словам перад прысутнымі выступіў сакратар камітэта камсамола універсітэта П. Брыгадзін. Потым У. Карагін, камандзір студэнцкага будаўнічага атрада імя Ленінскага камсамола, і А. Гаралёва, намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце, пазнаёмілі рабят з тым, як будзе праходзіць Ленінскі залік і грамадска-палітычная практыка ў пярвічных арганізацыях, паведамілі аб правядзенні Ленінскіх урокаў і Усесаюзнай ленінскай паверкі.

В. Левашэвіч, намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце, расказаў аб планаванні камсамольскай работы, аб тым, як працаваць з дакументамі.

Вучоба закончылася. Зараз камсамольскім кіраўнікам давядзецца праверыць яе на практыцы.

Н. ПЯТРОВА.

## Запрашаем да конкурсу

ПРАФКОМ БДУ імя У. І. Леніна, рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» аб'яўляюць конкурс на лепшы матэрыял аб прафсаюзным жыцці універсітэта. Матэрыялы і фотаздымкі прымаюцца да 30 красавіка 1980 года. Вынікі будуць падведзены да Дня друку па наступных раздзелах:

НА ЛЕПШЫ НАРЫС;
НА ЛЕПШЫ АРТЫКУЛ;
НА ЛЕПШАЕ ІНТЭРВ'Ю;
НА ЛЕПШУЮ ЗАМЕТКУ.

Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны граматамі прафкома і каштоўнымі падарункамі.

● У ЛАБАРАТОРЫІ ВУЧОНЫХ

## ТВОРЧАЯ АТМАСФЕРА

1978 ГОД—дата нараджэння лабараторыі фізічнай хіміі цэлюлозы НДІ фізіка-хімічных праблем пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Маладая лабараторыя, маладыя і яе супрацоўнікі. У асноўным гэта выпускнікі хімічнага факультэта універсітэта, якія пад кіраўніцтвам вопытных навуковых работнікаў праводзяць патрэбныя для народнай гаспадаркі даследаванні і распрацоўкі.

Калектыў лабараторыі вядзе работу па некалькіх напрамках. Мэта ўсіх распрацоўваемых у лабараторыі НДР —стварэнне новых матэрыялаў шляхам паляпшэння фізіка-хімічных уласцівасцей зыходнай цэлюлозы.

За кароткі тэрмін свайго існавання лабараторыя дасягнула пэўных поспехаў. Ужо зараз супрацоўнікі лабараторыі маюць два аўтарскія пасведчанні. Пададзена 8 заяў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў, 3 з іх атрымалі станоўчыя рашэнні. Вялікая колькасць навуковых артыкулаў, тэзісаў і дакладаў падрыхтавана супрацоўнікамі лабараторыі.

Творчая садружнасць звязвае лабараторыю з замежнымі краінамі. На навуковых семінарах лабараторыі неадназразова выступалі спецыялісты з ГДР. Многія супрацоўнікі лабараторыі рабілі даклады на міжнародных канферэнцыях, што сведчыць аб вялікім значэнні даследаванняў, праведзеных у лабараторыі.

З поўным правам лабараторыю можна назваць кузняй кадраў. Тут маладыя вучоныя атрымліваюць магчымасць расшырыць навуковы кругагляд, выпрабаваць сябе ў самастойнай навуковай даследчай рабоце, праявіць і развіць творчую ініцыятыву. У гэтым напрамку вялікую работу праводзіць загадчык лабараторыі Ф. М. Капуцкі. Шмат увагі ён удзяляе рабоце маладых вучоных, дапамагаючы і падтрымліваючы іх. Пад яго кіраўніцтвам старшы навуковы супрацоўнік Т. Л. Юркштовіч абараніла дысертацыю, аспірант С. В. Ткачоў падрыхтаваў дысертацыю да абароны.

На плённай навуковай рабоце, безумоўна, спрыяльна сказваецца атмасфера творчай прынцыповасці, узаемаразумення і ўзаемадапамогі ў калектыве.

Н. АНІКЕЕНКА,
супрацоўнік лабараторыі.

ПАЗБАЎЦЕ яе грамадскай работы. Пазбаўце. Камітэт камсамола, дэканат, сябры, вазьміце і адбярыце ў яе грамадскую работу, аддайце іншым. Ёй цяжка, такой маленькай, хрупкай, даверлівай і шчырай. Яна на трэцім курсе. Яна — кандыдат у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, намеснік сакратара камітэта камсамола фізічнага факультэта. Вось яна перад вамі, Раіса Тарасюк. Заступіцеся за яе. Давайце заступімся за яе. Давайце! І яна будзе ўдзячна нам. Удзячна?!

сур'ёзная і тады, на бульбе, будучы камісарам сельгасатрада! Яе не баяліся. Яе сорамна баяцца. Ёй давяралі, за ёй ішлі, як за сябрам, за камсоргам. За ёй ішлі як за камісарам, які павінен быць наперадзе, які павінен быць з усімі, чуць іх, адчуваць дыханне кожнага. А іх так многа, яе аднакурснікаў, такіх розных і неаднолькавых. Раіса, табе цяжка? Мы табе дапаможам. Хочаш? Не трэба. Мы можам яе пакрыўдзіць. Яна нічога не адкажа. Я ведаю. Яна толькі трасяне галавой. Ты прывыкла да гэтага, маленькую і непрыкметную. Адразу пасля бульбы. Яе, такую баязлівую дзяўчынку. Табе страшна было тады, Раіса? Што ты маўчыш? Яна не будзе маўчаць. Яна ўжо адказала. Страшна. Вядома. Вельмі баялася. Ты ж моцная, Раіса. Ты не павінна баяцца, смялей, табе ж даверылі, уся група даверыла. Гэта ж адносіны чалавека да працы, да яе абавязкаў. Яму не ўсё роўна, значыць, ён хоча быць такім, якім яго хочуць бачыць, якім ён павінен быць на самай справе. Быць самім сабой. Такім, які ты ёсць. Гэта

# ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЬ ХАРАКТАРУ

Раіса не даруе. Ніколі. Раіса пакрыўдзіцца. Раіса будзе абурацца. Яна проста не вынясе такой «удзячнасці». Яна кіне вучобу. Кіне, я ведаю. Пойдзе туды, дзе яе зразумеюць, дзе ёсць работа, дзе яна зноў адчуе сябе такой, якая яна зараз.

Выкіньце рыбу на лёд — і яна загіне: вельмі шмат паветра. Зрэжце кветку і пастаўце яе ў прыгожую вазу — яна завяне: ёй не хопіць сокаў, натуральных, зямных. Штучнымі не заменіш. Раіса, мы табе дапаможам. Хочаш? Уяві, што ты нічым не займаешся, што ты пазбаўлена грамадскай работы. Уявіла? Яна задасць пытанне. Я ведаю яе. Ведаю, якое яна задасць пытанне: «Уявіце, што Зямля плоская. Шэрая і плоская, як патэльня. Уявілі?» Якая недарэчнасць... Мы абураемся. Мы ўжо абурыліся. Зямля плоская. Якая недарэчнасць?! Мы пакрыўдзімся. Мы ўжо пакрыўдзіліся. Мы ·дапаможам Раісе? Яна смяецца з нас. Ты смяешся, Раіса? Яна будзе смяяцца з нас. Я ведаю. Яна можа смяяцца, звонка і шчыра, падзіцячаму і ў той жа час падаросламу. Вы бачылі, як яна смяецца? Загляніце ў яе вочы. Загляніце! Там, у куточках — сур'ёзнасць. Якая яна была Раіса? Прывыкла? З восьмага класа, калі цябе выбралі сакратаром камітэта камсамола школы. Да цяжкасцей, да работы, да людзей. Няўжо мы зноў памыліліся? Зноў недарэчнасць. Мы больш не будзем, чэснае слова. У чым недарэчнасць, Раіса, хіба нельга прывыкнуць? Яна не адкажа. Я ведаю яе, хоць не так даўно, але ведаю. Яна задасць пытанне. Вы можаце адвыкнуць піць ваду, дыхаць? Адчувалі, калі смага паліць вусны і не хапае паветра? Мы папросім. Дайце нам вады, паветра. Мы загінем. Мы працягнем руку. Гэта не прывычка, гэта патрабаванне — унутранае, фізічнае. У яе—патрабаванне чалавечае, яна не можа жыць без гэтага. Не зможа. Адбярыце ў яе гэта! Не дайце ёй вады, паветра. Не дайце! Жорсткасць. Якая жорсткасць! Мы абураемся. Якая нябачаная жорсткасць! Яна ж такая маленькая. Хрупкая. Пашкадуйце яе. Ёй цяжка. Што вы робіце! Толькі не гэта. Не трэба. Яна не любіць гэтага. Яна проста перастане нас паважаць. Я яе ведаю. Дык табе ж страшна, Раіса? Страшна, ну прызнайся? Толькі шчыра. Якая недарэчнасць! Без гэтага ж нельга, без шчырасці. Інакш бы яе не абралі камсоргам на першым курсе. Яе, такую маленькую... цяжка. Цяжка, Раіса? Маўчыш? Цяжка. Не бойся, Раіса, мы зразумеем. Мы ведаем нават, што ў цябе ідэальная група. Ведаем! У цябе ж ідэальная група? Ты смяешся. Ты абураешся? Якая недарэчнасць! Ты не пераносіш ідэальнага? Яно не можа быць у сапраўднасці. Ці могуць быць два лісты, падобныя адзін на адзін? Могуць? З мільёна лісцяў дрэва — толькі два! Якое глупства! Не будзем. Твая група — гэта часцінка цябе, тваё люстра. Гэта твая праца. У цябе яшчэ шмат працы наперадзе. Ты —кандыдат у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў. Табе страшна. Я ведаю, ёй страшна. Вельмі страшна. Яна мне прызналася.

Камітэт камсамола, дэканат, сябры, дайце ёй вады, паветра. Не адбірайце. Яна не вытрымае гэтага. Не адбірайце ў яе грамадскай работы. Яна справіцца з ёю. Ёй цяжка, страшна, такой маленькай і непрыкметнай. Яна мне расказвала. Яна справіцца. Ты моцная, Раіса? Я цябе ведаю, ты павінна справіцца, апраўдаць давер'е. Мы ўпэўнены ў гэтым, чэснае слова.

**Ул. БЕЛЬСКІ,**
**наш кар.**

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ПРАПАНОВЫ РЭАЛІЗУЮЦЦА

НА МІНУЛЫМ справаздачна-выбарным партыйным сходзе прагучала думка, што яшчэ не ўсе камуністы прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці вылічальнага цэнтра, а работа па ідэйна-маральнаму выхаванню павінна быць лепшай. Партыйнае бюро прааналізавала ўсе гэтыя крытычныя заўвагі, пажаданні камуністаў, і на гэтай аснове быў складзены план мерапрыемстваў па іх рэалізацыі. А для таго каб ахапіць усе бакі дзейнасці калектыву ВЦ, быў распрацаваны перспектыўны план работы партыйнай арганізацыі.

Было вырашана на пасяджэннях партбюро і партыйных сходах рэгулярна заслухоўваць справаздачы камуністаў аб рабоце над павышэннем свайго ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, актывізацыяй у вытворчай дзейнасці і выкананні партыйных даручэнняў. Так, на пасяджэннях партбюро ў жніўні быў заслуханы камуніст М. М. Пярчыніч, а ў лістападзе—камуніст І. Р. Ібатулін. Размова атрымалася шчырай і карыснай.

У практыку дзейнасці партыйнай арганізацыі трывала ўвайшлі рэгулярны аналіз і абагульненне выказваемых прапаноў, праводзіцца карпатлівая работа па іх рэалізацыі і інфармаванню камуністаў аб прынятых мерах.

У аснову работы партбюро па павышэнню эфектыўнасці ідэйна-выхаваўчай работы пакладзена пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы».

Партбюро старанна падабрала састаў ідэалагічнай камісіі, у якую ўключаны найбольш сталыя камуністы А. А. Платонаў, Т. А. Воднеў, Н. А. Каратаеў. Вялікая ўвага была ўдзелена падбору памочнікаў прапагандыстаў у сетцы палітычнай асветы. На сённяшні дзень можна сказаць, што даклады на філасофскіх семінарах сталі больш змястоўнымі, наведванне рэгулярным. Але гаварыць, што ўсе праблемы ўжо вырашаны, яшчэ рана.

Пакуль недастаткова ініцыятывы праяўляе камсамольскае бюро, якое не праводзіць настойлівай работы па ажыццяўленню намечаных мерапрыемстваў. Аб гэтым ішла сур'ёзная размова на партыйным сходзе ў снежні 1979 года.

Партыйнае бюро і далей будзе праводзіць паслядоўную работу па развіццю ініцыятывы, творчасці і росту прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў ВЦ з тым, каб заданні дзесятай пяцігодкі былі паспяхова выкананы.

**А. ЗАХАРЭНКА,**
**сакратар партбюро вылічальнага цэнтра.**





**Хімія — навука практычная. Таму сапраўдны хімік павінен умець рабіць складаныя вопыты, умець праверыць на практыцы праходжанне той ці іншай рэакцыі. Іменна таму лабраторныя заняткі, якія праходзяць ва ўтульных лабараторыях хімічнага факультэта, з'яўляюцца неад'емнай часткай у падрыхтоўцы будучых хімікаў.**

**На гэтых фотаздымках вы бачыце трэцякурснікаў хімфака ў час лабараторных заняткаў, якія праводзіць в. а. дацэнта кафедры арганічнай хіміі П. А. Малашка.**

Фота **М. Дубовіка.**

# ХТО Ў ВЫЙГРЫШЫ?

ЦЯПЕР, калі заходзіць гаворка пра факультэт грамадскіх прафесій, большасць ужо не задае пытанняў: «А што гэта такое? А дзе гэта?..» Сёлета на ім займаецца звыш 500 чалавек. Гэта лічба — лепшае пацвярджэнне папулярнасці ФГП. І ўсё ж нам хочацца выказаць думку аб тым, што пацягнула студэнтаў да вучобы на грамадскім факультэце.

Перш за ўсё, гэта, напэўна, прага новых ведаў у галіне грамадскай работы, авалоданне пэўным уменнем, накшталт харэаграфіі, фотасправы, акцёрскага майстэрства. Ды і сапраўды, чаму не авалодаць фатаграфаваннем, калі ты гэтага не ўмееш, навучыцца прыгожа танцаваць, калі ты гэтага хочаш? І таму на такія спецыяльнасці на ФГП было пададзена каля ста заяў. Але ёсць і адваротны бок медаля: калі ты нешта атрымліваеш, то патрэбна і аддаваць. Закончыўшы вучобу па спецыяльнасці, набыўшы веды ў галіне грамадскай работы, чаму ж не арганізаваць такому студэнту гурток па інтарэсах у падшэфнай школе ці інтэрнаце, тым больш, што праблема работы па месцу жыхарства стаіць вельмі востра і патрабуе комплекснага вырашэння. Неяк на пасяджэнні адказных за работу ФГП на факультэтах узнікла спрэчка па гэтаму пытанню. Намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па ідэалагічнай рабоце А. Гаралёва паставіла перад факультэтамі задачу прыцягнення студэнтаў—слухачоў ФГП да ўдзелу ў педатрадах. У адказ:

— А што калі студэнт захацеў проста навучыцца той або іншай справе?..

— Гэта таксама карысна, але мы для таго затрачваем сродкі, даручаем лектарам і выкладчыкам чытаць на факультэце лекцыі, каб навучыць некалькі дзесяткаў чалавек, якія б перадалі свае веды іншым. А тыя, хто проста хоча навучыцца, напрыклад, танцаваць, няхай ідуць займацца ў школу бальных танцаў, — гаворыць А. Гаралёва. Здаецца, думка А. Гаралёвай хаця і катэгарычная, але правільная.

І яшчэ. Часта слухачы, якія прапусцілі чарговыя заняткі, на пытанне, чаму яны адсутнічалі, адказваюць:

— У нас ёсць іншыя даручэнні на курсе, і іх таксама трэба выконваць...

На жаль, не ўсе ведаюць і разумеюць, што вучоба на ФГП — справа не асабістая, а грамадская, яна залічваецца як пастаяннае камсамольскае даручэнне. Гэта запісана ў пастанове камітэта камсамола. Але не трэба думаць, што калі ты займаешся на ФГП, то гэта дазваляе табе не ўдзельнічаць у жыцці камсамольскай арганізацыі. Для слухача ФГП галоўнае—найбольш поўна выкарыстоўваць атрыманыя веды на карысць факультэта і універсітэта. А таму ў час вучобы на факультэце грамадскіх прафесій рабяты актыўней займаюцца грамадскай работай; з ахвотай выконваюць камсамольскія і прафсаюзныя даручэнні. Так што ў выйгрышы аказваюцца і камсамольская арганізацыя, і студэнты, якія наведваюць заняткі па грамадскіх спецыяльнасцях. А значыць, трэба чакаць больш шырокага паступлення на ФГП.

**А. КОЗЕЛ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

# ВЯСКОВЫ ЛІРНІК

НАМ У СПАДЧЫНУ ад продкаў засталіся скарбы. Родная зямля, мова маці, песні народа, набытыя веды. Адны скарбы мы памнажаем сваёй працай, другія страчваем. Па каліву, па слоўцу, па чалавеку, па песні. Тым самым мы павялічваем другую спадчыну — спадчыну няведання. Частка яе кладзецца на плечы нашчадкаў — ці таму, што старэйшыя не паспелі зрабіць, ці адпаведныя умовы былі неспрыяльнымі. Гэта спадчына штучна прывіта народу. Трэба пазбаўляцца яе, белыя плямы запоўніць радкамі з першаасновай зместу...

У мінулым стагоддзі, калі родная мова была ў загоне, Беларусь загаварыла пра сябе на іншай мове—польскай. Ян Чачот, Адам Міцкевіч, Ян Баршчэўскі, Уладзіслаў Сыракомля, Юзэф-Ігнацы Крашэўскі, Эліза Ажэшка... Беларусь заспявала ў творах Міхала Агінскага, Станіслава Манюшкі, Міхала Глінкі. Адным з кампазітараў, імя якога зусім сёння забыта, быў Міхал Грушвіцкі. У кнізе «Таямніцы старажытных сховішчаў» (1974 г.) вядомы беларускі даследчык Адам Мальдзіс піша: «Нарадзіўся ён (кампазітар) 29 лістапада 1828 года у Выганічах ля Ракава. Вучыўся у Пецярбургскім універсітэце. У музычных кампазіцыях Грушвіцкага «гучала свойская, чуллівая мелодыя». Напісаў ён музыку да «Дзядаў» Мацкевіча, «Вясковага лірніка» Ул. Сыракомлі. Часта выступаў з аўтарскімі канцэртамі. Памёр у Ракаве 5 сакавіка 1904 года».

Што новага пра кампазітара выявілася ў апошні час?

На ракаўскіх могілках адшукана магіла кампазітара. Высокі каменны помнік пад кашлатымі соснамі сваёй арыгінальнасцю набывае яшчэ большае значэнне. З левага боку помніка змешчаны, бадай, першы вядомы фрагмент з музычнай спадчыны кампазітара. Словы эпітафіі «Тут наш лірнік вясковы сканаў, граючы на ліры» звязалі імя Грушвіцкага з Ул. Сыракомлем, які напісаў вершы «Лірнік вясковы» (1852 г.) і «Вясковы музыка» (1854 г.), прысвечаныя Станіславу Манюшку. У згаданым першым вершы ёсць такія радкі:

Няхай баліць рука, няхай сэрца
згарыць датла,
Буду граць на магілы;
А не стане мовы,
і я, лірнік вясковы,
Сканаю, граючы на ліры.

Нават гэты далёка не першкласны пераклад перадае ідэю самаадданай працы на карысць народу, які ўскарміў паэта сваімі песнямі, сваёй паэзіяй. Гэтымі ж песнямі, казкамі быў спавіты і Міхал Грушвіцкі. Акружаючыя жыхары успаміналі, што гэта быў сумленны чалавек, з сялянамі размаўляў па-тутэйшаму, г. зн. па-беларуску.

Кніга Соф'і Кавалеўскай «З успамінаў выгнанніка», выдадзеная у Вільні ў 1911 г., дазваляе прачытаць новую старонку ў жыцці кампазітара — дачыненне да паўстання 1863 года. Непасрэднага ўдзелу Грушвіцкі ў паўстанні не прымаў (ва ўсякім разе не захавалася прамых доказаў яго ўдзелу, дарэчы, як і В. Дуніна-Марцінкевіча). Але вось што мы чытаем у прыведзеных успамінах Апалінарыя Свентарэцкага, прызначанага на час паўстання начальнікам ракаўскай акругі: з Мінска «рушыў да Ракава са сціснутым сэрцам... Пасля падаўся да Люцінкі Марцінкевічаў, дзе мне аказалі пэўную дапамогу. Адтуль паслаў любага мне Грудзінскага вербаваць людзей у Пяршаях... Пасля падаўся паводле выпрацаванага маршруту да Выганічаў, уласнасці Міхала Грушвіцкага (вядомага музыкі і найгасціннейшага гаспадара), дзе далучыўся да нас дворскі рымар Рыгор Гавароўскі»...

На жаль, Апалінары Свентарэцкі больш не прыводзіць імя Грушвіцкага ва ўспамінах.

Што новага можна раскрыць у жыцці кампазітара?

На маю думку, бясспрэчна, існавала знаёмства Дуніна-Марцінкевіча з Грушвіцкім. Іх маёнткі знаходзілся ў 15—20 кіламетрах адзін ад аднаго. Праз Дуніна-Марцінкевіча Грушвіцкі мог пазнаёміцца з Ул. Сыракомлем і пад непасрэдным уплывам сустрэч з ім і яго твораў напісаць музыку да «Вясковага лірніка».

**Я. ЯНУШКЕВІЧ,**
**студэнт 4-га курса філалагічнага факультэта.**

# ГАНАРОВЫ ГОСЦЬ

ЦЁПЛА, з радасцю сустрэлі студэнты і супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна свайго земляка, Героя Савецкага Саюза, лётчыка-касманаўта СССР Уладзіміра Васільевіча Кавалёнка. Ганаровы госць расказаў аб шляхах развіцця савецкай касманаўтыкі, спыніўся на праблемах, якія стаяць перад вучонымі і медыкамі пры рабоце над задачай павелічэння тэрміну знаходжання касманаўтаў у бязважкавай прасторы. У. В. Кавалёнак пазнаёміў з некаторымі пытаннямі падрыхтоўкі касманаўтаў да доўгатэрміновага палёту, расказаў аб 140-сутачным палёце, які здзейсніў сумесна з лётчыкам-касманаўтам А. С. Іванчэнкавым. З цікавасцю даведаліся прысутныя аб дапамозе Зямлі касманаўтам у час іх работы на станцыі «Салют-6». Часта лётчыкі-касманаўты мелі магчымасць гутарыць па касмічнай сувязі з роднымі, сваімі сем'ямі. Выдатнаму выкананню намечанай праграмы і пераадоленню ўплыву на арганізм безважкасці садзейнічалі фізічныя практыкаванні.

Перад прысутнымі таксама выступіў доктар геаграфічных навук прафесар А. М. Мурамцаў. У заключэнне сустрэчы У. В. Кавалёнак адказаў на пытанні студэнтаў.

Лётчык-касманаўт азнаёміўся з універсітэтам, сустрэўся са студэнцкім будаўнічым атрадам імя Ленінскага камсамола, ганаровым байцом якога ён з'яўляецца.



Фота М. Дубовіка.





# Сябар беларускай літаратуры

*Аўтар гэтага артыкула, Вахтанг Салія, прыехаў да нас тры гады назад з Тбіліскага дзяржаўнага універсітэта. Прыехаў, каб вывучыць беларускую мову і літаратуру, гісторыю і прыроду Беларусі. Усё гэта спатрэбіцца яму ў будучым — пры перакладзе твораў беларускіх пісьменнікаў на грузінскую мову, даследаванні грузінска-беларускіх культурных узаемасувязей.*

*Вахтанг займаецца ў навуковым семінары «Праблемы мастацкага перакладу», піша дыпломную работу «Беларусь у жыцці і творчасці Канстанціна Лордкіпанідзе». Веды — і моўныя, і чыста навуковыя—з поспехам выкарыстоўвае ён у дакладах на семінарскіх занятках, пры напісанні дыпломнай работы.*

*Думаю, чытачы «Беларускага універсітэта» з цікавасцю пазнаёмяцца з артыкулам В. Салія пра вядомага грузінскага пісьменніка К. Лордкіпанідзе, якому нядаўна споўнілася 75 гадоў.*

**В. РАГОЙША,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

У 1929 ГОДЗЕ часопіс «Узвышша» ў адным са сваіх нумароў пісаў: «Калі К. Лордкіпанідзе ганіць патрыятычны лад («Продкам»), руіны мінулага і гістарычныя найменні, якія прыгнечваюць свядомасць, дык у яго адчуваецца зусім новы чалавек, які будуе новы свет. Паэт усвядоміў, што яго праца таксама ёсць утылітарна важны фактар будаўніцтва новага жыцця. («Паэт да мас»). У сваёй багатай лірычнасці ён рэагуе на ўсё пачуццём пралетарскага паэта. Нават у паэтычнай трактоўцы пытання пра каханне, пра жанчыну Лордкіпанідзе выявіў класавае чуццё» («Ліст да каханай»).

З артыкула ва «Узвышшы» беларускі чытач упершыню пазнаёміўся з творчасцю тады яшчэ пачынаючага пісьменніка Канстанціна Лордкіпанідзе — сёння шырокавядомага майстра грузінскай савецкай літаратуры.

К. Лордкіпанідзе нарадзіўся 75 гадоў таму назад у сяле Дыды Джыхайшы, зараз Самтрэдыіскага раёна, у сям'і служачага. У 1924 годзе ён скончыў Кутаіскі гуманітарны тэхнікум і пачаў літаратурную дзейнасць.

Можна сказаць, што з таго памятнага часу пачалася яго сувязь з беларускай рэчаіснасцю і беларускай літаратурай. У саставе брыгады Саюза савецкіх пісьменнікаў Грузіі, якая наведала Беларусь у маі 1935 года, разам з І. Мосашвілі, Р. Гветадзе, А. Кутатэлі, Б. Буачыдзе быў і К. Лордкіпанідзе. Сардэчна сустракалі гасцей з Грузіі Я. Купала, Я. Колас і іншыя пісьменнікі.

К. Лордкіпанідзе з групай грузінскіх пісьменнікаў праслухаў лекцыі пра беларускую прозу, паэзію, драматургію, кінадраматургію, дзіцячую літаратуру, крытыку. Ён пабываў на заводах, фабрыках, у калгасах, саўгасах, пагутарыў з працаўнікамі Савецкай Беларусі, сваімі вачыма ўбачыў гістарычны шлях, пройдзены беларускім народам. К. Лордкіпанідзе застаўся ў Беларусі на некалькі месяцаў. Найбольшую яго цікавасць выклікала Палессе, змены, якія ўвачавідкі адбыліся ў гэтым, калісьці «забытым богам і людзьмі» кутку Беларусі.

Вынікам яго паездкі з'явіліся «Беларускія апавяданні», якія аўтар лічыць адными з лепшых у сваёй творчасці. У гэты празаічны цыкл пад агульнай назвай «Бяссмерце» ўвайшлі чатыры апавяданні, якія расказваюць пра імперыялістычную вайну, пра вызваленне Беларусі ад нямецкіх і польскіх захопнікаў. Апавяданні аб'ядноўваюцца адным героем-селянінам, дзедам Рухлай.

Пісьменнік змог пераканаўча перадаць беларускі нацыянальны характар героя. Вобраз дзеда Рухлы пераклікаецца з вобразам коласаўскага дзеда Талаша, нагадвае вобраз дзеда Бадыля з п'есы К. Крапівы «Партызаны».

К. Лордкіпанідзе зацікавіўся беларускай літаратурай. У сваім артыкуле, які быў надрукаваны 6 жніўня 1935 года ў газеце «Літаратура і мастацтва», ён параўноўвае грузінскую і беларускую літаратуру і піша: «У Грузіі пераважнае месца заўсёды займала паэзія, а ў Беларусі мы маем вялікі росквіт прозы».

К. Лордкіпанідзе як крытык беларускай літаратуры высока ацаніў «Дрыгву». Гэтая кніга, па яго словах, вельмі дапамагла яму, паколькі К. Лордкіпанідзе вывучаў партызанскі рух на Мазыршчыне. Зацікавіла яго і творчасць Платона Галавача. Яго кнігу «Праз гады» ён лічыў «перамогай усёй савецкай літаратуры».

К. Лордкіпанідзе некалькі разоў перакладаўся на беларускую мову. Яго празаічныя творы, вершы былі надрукаваны на старонках некаторых беларускіх часопісаў і газет. У прыватнасці, у Беларусі вельмі добра ведаюць раман К. Лордкіпанідзе «Далоў кукурузную рэспубліку» (зараз называецца «Зара Калхіды»). Урыўкі з твора (яшчэ ў 30-я гады) перакладалі на беларускую мову С. Знаёмы, Хв. Шынклер. Поўны пераклад гэтай кнігі ажыццявіў Кузьма Чорны ў 1936 годзе.

Пасля 1936 года К. Лордкіпанідзе некалькі разоў звяртаўся да свайго рамана, дапаўняў яго новымі героямі, змяніў назву. І цяпер кожны, хто цікавіцца савецкай літаратурай, ведае яго «Зару Калхіды» як адну з лепшых кніг нашай сацыялістычнай літаратуры.

К. Лордкіпанідзе — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У мірныя гады працаваў галоўным рэдактарам часопісаў «Літаратурная Грузія», «Ціскары», быў дырэктарам выдавецтва «Нахадулі».

Ён надрукаваў, апрача тых твораў, пра якія мы гаварылі, цыкл апавяданняў «Праўдзівыя расказы», «Незаржавелы клінок», вершы, успаміны, публіцыстычныя творы і інш.

К. Лордкіпанідзе ўзнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі.

Нягледзячы на свае 75 гадоў, К. Лордкіпанідзе і зараз працуе з маладзецкім запалам.

І што б ён ні рабіў, дзе б ні быў, ён заўсёды памятае беларускую старонку сваёй творчасці.

**В. САЛІЯ.**

# Камертон

## Музычны клуб

### Выпуск першы

**ДЗЯЖУРНЫЯ ПА КЛУБУ В. КІРЫЛЬЧЫК І С. ЛЫСКАВЕЦ**

**«ДОБРЫ ДЗЕНЬ, паважаная рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт»! Мы даўно чытаем вашу газету. Часта сустракаем у ёй матэрыялы, прысвечаныя камсамольскаму, працоўнаму, спартыўнаму жыццю універсітэта. Але восьмузычнай старонкі ў газеце, на жаль, няма. Мы любім і захапляемся музыкай. Нам бы вельмі хацелася, каб вы расказалі аб вядучых музычных калектывах нашай краіны, а таксама аб папулярных замежных групах і вакалістах. Мы ведаем, што да нашай просьбы далучацца многія студэнты нашага універсітэта.**

**Тацццяна КАЛЯДЗІЧ і Алена ДЗЕХЦЯРЭНКА, студэнткі механіка-матэматычнага факультэта».**

Вялікае дзякуй, дзяўчаты, за ваша пісьмо!

Сапраўды, колькасць аматараў сучаснай музыкі няспынна расце і асабліва сярод моладзі. Але, на жаль, не заўсёды тое, што слухаюць, запісваюць на магнітафоны аматары папулярнай музыкі, адпавядае патрабавальнаму густу, прывіццё якога адыгрывае вялікую ролю ў выхаванні музычнай культуры сярод моладзі. На гэта звярнуў сваю ўвагу XVIII з'езд ВЛКСМ, аб гэтым гаварылася ў пастанове ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы». Таму сёння рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» адкрывае на сваіх старонках музычны клуб «Камертон». На яго пасяджэннях будзе падрабязна і ўсебакова расказвацца аб кампазітарах і выканаўцах, аб важнейшых напрамках і тэндэнцыях у сучаснай музыцы, будуць паведамляцца апошнія навіны музычнага жыцця. Будзе таксама расказвацца аб вопыце работы і праблемах маладзёжных дыскатэк.

Вось з такімі ідэямі, і перш за ўсё з думкай аб неабходнасці такой справы, мы і прымаемся за наш музычны клуб. А паколькі «Камертон» толькі-толькі пачынае сваё існаванне, нам бы вельмі хацелася, каб вы, паважаныя чытачы, дасылалі ў рэдакцыю свае допісы з уражаннямі аб першым выпуску «Камертона». Што спадабалася, што запомнілася, што хацелася б убачыць на яго старонках. Адным словам, пішыце, прапануйце, райце, рабіце заўвагі. Чакаем вашых водгукаў!

СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

## Песні аб жыцці

«ЧАСТА здаецца яму, што ён, як і раней, — «містэр Ніхто», і ён зноў блукае па вуліцах. Ён марыць пра сапраўднага сябра, з якім можна было б падзяліць усё: і гора, і радасць, з якім бы ён перарабіў увесь свет»,— так спявае ў адной са сваіх песень вядомы нямецкі спявак Уда Ліндэрберг.

На сцэне папулярнай музыкі ў ФРГ пераліваюцца рознакаляровыя фарбы. Рок, поп, фольк, джаз... Агульная мэта гэтай музыкі ва ўсёй сваёй разнастайнасці форм — забаўляць. Забаўляць усюды, забаўляць заўжды. І нібы глыбокі роў падзяляе тых, хто зацікаўлены ў гэтым забаўленні, і тых, хто імкнецца да пошуку ў музыцы сапраўднага, каштоўнага.

Уда Ліндэрберг заўсёды ў пошуку. Ён належыць да невялікай групы музыкантаў, кампазітараў і аўтараў, якая абрала сабе шлях: стварыць «поп», але не адмяжоўваецца ад рэчаіснасці. Спяваць песні, якія расказваюць пра жыццё людзей; песні, у якіх можна знайсці адлюстраванне чалавечых праблем. Можа таму Уда Ліндэрберг стаў зоркай эстрады без дапамогі рэкламнай кампаніі фірмаў грамзапісу.

Якія ж рысы, уласцівыя гэтаму трыццацідвухгадоваму спеваку (раней ён быў барабаншчыкам) і яго аркестру «Панік», адрозніваюць Уда ад вялікай колькасці «дзяльцоў» музыкі «поп»?

Спачатку аб музыцы. У большасці сучасных песень кампазіцыйныя ідэі распрацоўваюцца мала. Адна песня падобна на другую. Да высокай якасці даведзены толькі схематычныя гукавыя эфекты.

Уда Ліндэрберг і яго аркестр «Панік» у параўнанні з іншымі выконваюць тыя ж самыя «рок-н-ролы» з вялікім майстэрствам. Галоўным тут з'яўляецца тое, аб чым спявае сам Уда. А спявае ён пра адзіноцтва чалавека ў капіталістычным грамадстве, пра адносіны паміж людзьмі. Прастата і дасціпнасць, змястоўнасць і лірычнасць — вось што выклікае ў слухачоў давер'е. Моладзь знаходзіць у песнях Уда Ліндэрберга нейкую асабістую мову, свой стыль выказвання, сваю манеру гутаркі. Але спявак не карыстаецца жаргонам. У тэкстах яго песень гучаць звычайныя словы. Таму на канцэртах Уда Ліндэрберга прысутнічаюць дзеці і маладыя людзі, якія без славутага «экстазу» вітаюць кожнае выступленне словамі: «Урэшце адзін гаворыць свету аб тым, што робіцца ў нашай душы».

## Усесаюзная фірма грамзапісу «Мелодыя»

— гэта восем студый, якія ствараюць штогод каля 1200 грамплацінак з новымі запісамі, гэта сем заводаў з гадавым аб'ёмам вытворчасці звыш 200 мільёнаў грамплацінак і касет, шырока развітая сетка фірменных магазінаў, дазваляючых данесці грамплацінку ў самыя аддаленыя куткі нашай краіны. Зараз фірма «Мелодыя» мае ў сваім арсенале адзін з багацейшых у свеце каталогаў, які налічвае каля 30 тысяч назваў грамплацінак самых разнастайных жанраў. У гэтым каталогу прадстаўлены запісы на 70 мовах народаў СССР і замежных краін. Акрамя таго, фірма «Мелодыя» пастаўляе сваю прадукцыю ў 82 краіны свету. Па яе ліцэнзіях выпускаюць грамплацінкі такія вядомыя замежныя фірмы, як «Калумбія» (ЗША), «Арыёла-Эўрадыск» (ФРГ), «Віктар» (Японія) і іншыя.

## Панарама

СВОЙ ТРЭЦІ дыск-гігант запісала нядаўна вядомая спявачка з ГДР Вераніка Фішэр. Па свайму стылю музычныя творы спявачкі падобны на джазавыя імправізацыі. Гэтаму садзейнічаюць і тэксты песень, напісаныя Куртам Дэмлерам, які вельмі ўдала спалучае паэтычныя вобразы з музыкай.

* * *

НЯГЛЕДЗЯЧЫ на тое, што англійская група «Бітлз» распалася амаль дзесяць год назад, колькасць яе прыхільнікаў не памяншаецца. У 1978 годзе ў ЗША прайшоў тыдзень рэкламы ансамбля, на які было затрачана звыш мільёна долараў. А ў 1977 годзе быў нават выпушчаны новы альбом «Бітлз». Справа ў тым, што ў архівах быў знойдзены запіс з канцэртаў у Галівудзе 23 жніўня 1964 года і 30 жніўня 1965 года. У выніку вялікага шуму гледачоў і малой магутнасці апаратуры ансамбля запіс не маглі выкарыстаць у той час, і ніхто з удзельнікаў «Бітлз» нават і не думаў выпускаць пласцінку. У наш час гэта стала магчымым. Жорж Марцін, прадзюсер групы, які знайшоў гэты запіс, паўторна мікшыраваў яго і даваў да якасці, неабходнай для выпуску пласцінкі.

* * *

ВЯДОМЫ спявак, кампазітар і аранжыроўшчык Элтан Джон, які з'яўляецца аўтарам вялікай колькасці папулярных кампазіцый, запісаў чарговую пласцінку пад назвай «Адзінокі чалавек». Гэты альбом складаецца з розных па свайму характару музычных твораў, колькасць якіх дасягае адзінаццаці. Дыск, безумоўна, зацікавіць усіх, хто шукае ў сучаснай музыцы сапраўдных каштоўнасцей, якія зараз вельмі цяжка знайсці ў машыне заходняга музычнага бізнесу.

## З нашай пошты

## Гурток дзейнічае

ПРАБЛЕМА суадносін свядомасці і быцця, творчасць Дастаеўскага, будучае чалавецтва, законы функцыяніравання культуры — вось некаторыя з тэм, якія абмяркоўваліся на пасяджэннях гуртка «Філасаф» пры кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў. Гурток аб'ядноўвае не толькі студэнтаў-філасафаў, але і ўсіх тых, каго цікавяць пытанні, якія мы абмяркоўваем. Таму да нас прыходзяць студэнты іншых факультэтаў універсітэта, медыцынскага і тэатральна-мастацкага інстытутаў.

Нядаўна было праведзена чарговае пасяджэнне нашага гуртка на тэму «Будучае чалавецтва». Праблема будучага ў наш час з'яўляецца прадметам вострай ідэалагічнай барацьбы паміж вучэннем марксізму-ленінізму і рознымі напрамкамі буржуазнай ідэалогіі. Яна з'яўляецца актуальнай у сувязі з узрастаннем утапічных форм свядомасці ў розных масавых рухах сучаснасці. У прыватнасці, у сувязі з ідэалогіяй «новых левых». Яна ўзнікае таксама ў сувязі з многімі праблемамі сучаснай сацыяльнай навукі, у асаблівасці з праблемамі сацыяльнага прагназіравання. Вельмі востра паўстае гэта праблема і ў сувязі з развіццём сучаснага мастацтва і мастацкай літаратуры.

Усё гэта і з'явілася прадметам абмеркавання на пасяджэнні гуртка. А ў планах— шмат іншых цікавых тэм. Гурток «Філасаф» заўсёды рады гасцям, тым, для каго філасофія—не сумны прадмет, а сродак асэнсавання складаных з'яў рэчаіснасці.

**В. СІВІЦКАЯ, староста гуртка.**

## Эстафета дружбы

МОЦНАЯ дружба звязвае студэнтаў 11-й групы І курса механіка-матэматычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна з 17-й групай ГПТВ № 114 будаўнікоў.

— Не адразу ўсё наладзілася, — расказвае адказная за шэфскі сектар Алена Емяльянчанка, — нявесела сустрэлі нас і рабіты. Холад адчуваўся ў іх стрыманых адказах, размове, адносінах да нас. Але час ішоў. Адчужанасць паступова знікала. І вось зусім нядаўна навучэнцы ГПТВ наведалі нас, пазнаёміліся з гісторыяй стварэння універсітэта, даведаліся аб жыцці сваіх шэфаў, аб іх вучобе, працоўных справах.

...Гучаць кранаючыя за душу словы песень у выкананні Віктара Рукана, радаснае захапленне выклікаюць старадаўнія танцы, якія па-майстэрску выконваюць Валянціна Радзевіч і Тамара Шляхценка, не пакідаюць раўнадушнымі выступленні Ірыны Валасевіч, Марыны Юрэвіч. Ідуць апошнія рэпетыцыі... Студэнты-першакурснікі працягваюць цудоўныя традыцыі сваіх старэйшых таварышаў. Хочацца пажадаць ім з гонарам пранесці эстафету дружбы і ўзаемаразумення.

**А. ЛІПА, студэнтка І курса механіка-матэматычнага факультэта.**



Фота **А. Еліна.**

## Дні донара

**У НАШАЙ краіне развіццю донарства аддаецца вялікая ўвага. У мінулым годзе 1600 студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта бясплатна далі сваю кроў для пералівання і вырабу прэпаратаў з крыві. Прынцып развіцця гэтага высакароднага і гуманнага руху: максімум карысці хвораму і ніякай шкоды донару!**

**Выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі, уступайце ў рады донараў!**

**Чакаем вас на донарскім пункце 14—15 лютага ў аддзяленні паліклінікі БДУ з 10-00 да 14-00 гадзін.**

**КАМІТЭТ ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФСАЮЗНЫ КАМІТЭТ.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

14 лютага 1980 г.

Заказ № 288. АТ 15060

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара В. П. ВАРАБ'ЁЎ